Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 ЧЭРВЕНЯ 2016 г. ПЯТНІЦА № 119 (28229) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Спёка ідзе...**

СТАР. 15



**Цікавыя моманты Еўра-2016**

СТАР. 16



**Праграма тэлебачання на тыдзень**

**20 КАНАЛАЎ**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір АРЛОЎСКІ, першы намеснік старшыні Дзяржаўнага мытнага камітэта:**

*«Па ініцыятыве Мытнага камітэта сумесна з пагранічнай службай у шасці беларускіх пунктах пропуску на мяжы з Літвой, Латвіяй і Польшчай з чэрвеня гэтага года замест папяровых кантрольных талонаў уведзена ў рэжым доследнай эксплуатацыі аўтаматызаваная сістэма ўліку пропуску фізічных асоб, транспартных сродкаў і тавараў. Гэтая тэхналогія дазваляе ўдасканаліць працэс праходжання мяжы, зрабіць яго больш аўтаматызаваным, сучасным і зручным».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.06.2016 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 19801,00 | ▲ |
| Еўра | 22426,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 308,06 | ▼ |
| Укр. грыўня | 795,66 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# Асілкі для хлебаробаў




Фота БЕЛТА.

Учора ў механізатараў з Віцебскай вобласці быў асаблівы дзень. У сталіцы, ля Мінскага трактарнага завода, ім уручылі ключы ад дзесяці новенькіх трактароў «Беларус 3522».

Магутныя сучасныя машыны будуць працаваць на палях у розных раёнах поўначы краіны.

Напрыклад, у ААТ «Лаўжанскае» Шумілінскага раёна — механізатар гаспадаркі Андрэй КАХАЕЎ прыехаў на МТЗ забраць свайго жалезнага памочніка.

## ПЯЦІГОДКА: мэты і прыярытэты

**Галоўная мэта развіцця Беларусі на 2016-2020 гады – павышэнне якасці жыцця насельніцтва.**

**У 2020 годзе прырост да 2015 года складзе:**

| | |
|---|---|
| ВУП | 12,1-15% |
| прадукцыйнасці працы па ВУП | 12,8 - 15,1% |
| выпуску прадукцыі прамысловасці | 9,1 - 15,2% |
| выпуску прадукцыі сельскай гаспадаркі | 12,6 - 15% |
| інвестыцый у асноўны капітал | 12 - 14,9% |
| экспарту тавараў і паслуг | 21-25% |
| рэальных грашовых даходаў грамадзян | 9,5 - 11,6% |

За пяцігодку плануецца пабудаваць **звыш 18 млн кв.м** жылля.

**Для дасягнення пастаўленых мэт развіццё краіны будзе грунтавацца на ключавых прыярытэтах:**

ІНВЕСТЫЦЫІ, ЭКСПАРТ, МОЛАДЗЬ, ЗАНЯТАСЦЬ, ІНФАРМАТЫЗАЦЫЯ

Крыніца: Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь на 2016-2020 гады, адобраная дэлегатамі пятага Усебеларускага народнага сходу.

© Інфаграфіка БЕЛТА

# Улічыць усё

**Пяты Усебеларускі народны сход учора завяршыў сваю работу. Дэлегаты плённа папрацавалі, выказалі свае думкі наконт таго, як развівацца дзяржаве, якія сферы стануць у гэтай пяцігодцы вядучымі, пра што трэба паклапаціцца — бо інакш страчанага не вернеш. Прыцягненне інвестыцый, інавацый, экспарт, развіццё прыватнай ініцыятывы, міралюбівая знешняя палітыка, Год культуры, ахова здароўя, сацыяльная абарона, развіццё малых вёсак — гэта толькі некаторыя з пытанняў, што падымаліся на сходзе.**

**У выніку дзве з паловай тысячы дэлегатаў ухвалілі праект Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады.**

СТАР. 2–4